


Складальнік і камп'ютарны набор: Цюленева Н.В.

ДУК "Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А. С. Пушкіна"

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Старонкі гісторыі Мазыршчыны



## Каляндар памятных дат і падзей на 2026 год

# Каляндар памятных дат
# і падзей на 2026 год

## Агульныя даты

**520 гадоў** з часу мецяжа (1506 г.) Міхаіла Глініцкага і ўзяцце ім г. Мазыра.

**505 гадоў** з часу спалення (1521 г.) г. Мазыра мангола-татарамі.

**425 гадоў** з часу вялікага пажара (1601 г.) ў Мазыры, які знішчыў драўляны замак.

**410 гадоў** з часу залажэння (1616 г.) касцёла Узнясення Маці Божай (не захаваўся).

**270 гадоў** з часу паўстання (1756 г.) мазырскіх сялян супраць польскіх феадалаў.

**250 гадоў** з часу першага ўпамінання (1776 г.) аб хутары Козенкі.

**230 гадоў** з часу першага ўпамінання (1796 г.) аб в. Хамічкі.

**205 гадоў** з часу адкрыцця ( 1821 г.) ў маёнтку в. Барбароў школы для дзяцей сялян, працавала некалькі гадоў.

**200 гадоў** з часу ўпамінання (1826 г.) аб в. Балажэвічы.

**145 гадоў** з часу забойства (1881 г.) ў Петраградзе членамі народніцкай арганізацыі «Народная воля» цара Аляксандра ІІ. Па справе першасакавікоўцаў была асуджана ўраджэнка Мазыра Геся Гельфман.

**135 гадоў** з часу заканчэння працы (1891 г.) на Палессі археалагічнай экспедыцыі беларускага археолага В. З. Завітневіча (акруга Мазыра: в. Скрыгалаў, Надаткі, Слабада, Барыскавічы і інш.), даследаванні аб дрыгавічах у IX - XII ст.ст.

**120 гадоў** з часу (1906 г.), калі ў в. Скрыгалаў Мазырскага раёна на месце забойства кіеўскага метрапаліта Макарыя была пабудавана капліца ў імя свяшчэннамучаніка Макарыя Кіеўскага. Паводле кампазіцыі і вобліка нагадвае Гомельскую капліцу-пахавальню Паскевічаў.

**120 гадоў** з часу (1906 г.) як прадстаўнікі з г. Мазыра ўдзельнічалі ў выбарах у Дзяржаўную Думу.

**105 гадоў** з часу заснавання (1921 г.) Мазырскай раённай грамадска-палітычнай газеты «Жыццё Палесся». Газета выходзіць тры разы на

**23** - **105 гадоў** з дня нараджэння **Дзмітрыева Міхаіла Афанасьевіча** (23.09.1921, в. Барсукі Кармянскага раёна Гомельскай вобласці - 10.10.2001, г. Гомель), педагога. Заслужаны настаўнік Беларускай ССР (1964). Герой Сацыялістычнай працы (1971). Кандыдат педагагічных навук (1971). Доктар педагагічных навук (1993). Рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай (1974-1985). Дацэнт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны (1985-1999).

## Кастрычнік

**17** - **100 гадоў** з дня нараджэння **Куркевіча Карла Станіслававіча** (17.10.1926, г. Мазыр - 19.03.2002), поўнага кавалера ордэна Славы. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі і польшчы, Берлінскай аперацыі. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Славы 1-й, 2-й і 3-й ступені, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі.

**28** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Лагіра Вячаслава Міхайлавіча** (н. 28.10.1946, г. Мазыр), заслужаннага ваеннага спецыяліста Расійскай Федэрацыі. Контр-адмірал (1992). Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пасля выхаду ў адстаўку выкладае на Вышэйшых спецыяльных афіцэрскіх курсах ВМФ (Санкт-Пецярбург, РФ).

## Лістапад

**1** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Кадола Фёдара Уладзіміравіча** (н. 01.11.1946, в. Васькаўка Мазырскага раёна), беларускага вучонага ў галіне педагогікі. Доктар педагагічных навук. Прафесар. Выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь. Працуе загадчыкам кафедры ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны.

**1** - **105 гадоў** з дня нараджэння **Жураўля Іосіфа Нічыпаравіча** (04.11.1921, в. Буда Казіміраўская Мазырскага раёна - 2010, Мазырскі раён), удзельніка Парада Перамогі 24 чэрвеня 1945 г. у складзе воінаў зводнага палка 4-га Украінскага фронту.

**6** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Зубоўскага Анатолія Сцяпанавіча** (н. 06.11.1946, г. Мазыр), Ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (1998).

**22** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Басуматравай Святланы Міхайлаўны** (22.11.1946, г. Мазыр - 29.05.2016, г. Бабруйск), беларускай пісьменніцы. Член Саюза пісьменнікаў БССР (1982). Пачала друкавацца з 1960 г. Пісала на беларускай і рускай мовах.

**23** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Саўчыка Міхаіла Уладзіміравіча** (н. 23.06.1946, в. Маісееўка Мазырскага раёна) - кандыдат сельскагаспадарчых навук, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, Ганаровы грамадзянін Мазырскага раёна.

**26** - **80 гадоў** з дня нараджэння **Шура Васіля Васільевіча** (н. 26.06.1946, в. Стадолічы Лельчыцкага раёна), беларускага мовазнаўства. Доктар філалагічных навук (2004). Прафесар (2006). Працуе ў Мазырскім педагагічным універсітэце імя І. П. Шамякіна. Даследуе праблемы беларускай лексікаграфіі, лексікалогіі, літаратурнай анамастыкі. Аўтар шматлікіх манаграфій, вучэбных дапаможнікаў.

## Ліпень

**26** - **95 гадоў** з дня нараджэння **Калыхана Леаніда Іванавіча** (26.07.1931, в. Слабада Мазырскага раёна - 27.07.2003), беларускага вучонага ў галіне ядзернай энергетыкі. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1984). Доктар тэхнічных навук (1977). Прафесар (1979). Аўтар звыш за 100 навуковых прац, у т.л. 3 манаграфій, 45 вынаходніцтваў.

## Жнівень

**5** - **90 гадоў** з дня нараджэння **Захарава Пятра Сяргеевіча** (05.08.1936, в. Карпавічы Светлагорскага раёна - 24.02.2013, г. Мазыр), беларускага мастака. Члена Беларускага саюза мастакоў (1980). Працаваў у галіне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва, станкавым жывапісе. Узнагароджаны медалём за заслугі ў выяўленчым мастацтве (2001).

**22** - **90 гадоў** з дня нараджэння **Крылова Уладзіміра Пятровіча** (22.08.1936, в. Бібікі Мазырскага раёна), беларускага вучонага ў галіне кардыялогіі. Доктар медыцынскіх навук (1984). Прафесар (1989).

**28** - **65 гадоў** з дня нараджэння **Рогавай Ірыны Ігараўны** (н. 28.08.1956, в. Бібікі Мазырскага раёна), грамадскі дзеяч, Прэзідэнт фонду садзейнічання развіццю расійска-беларускага супрацоўніцтва «Белыя росы».

## Верасень

**6** - **45 гадоў** з дня нараджэння **Назаранкі Андрэя Аляксеевіча** (н. 6.09.1981, г. Мазыр ), беларускага спартсмена (шатакан каратэ-до). Майстар спорту Рэспублікі Беларусь (2003). Чэмпіён свету (2002, Германія). Чэмпіён Еўропы (2003, Кіеў).

тыдзень на рускай і беларускай мовах. Заснавальнікі: Мазырскі раённы выканаўчы камітэт і Мазырскі раённы Савет дэпутатаў.

**100 гадоў** з часу заснавання (1926 г.) педагагічнага тэхнікума ў г. Мазыры.

**90 гадоў** назад (1936 г.) пачаўся кругласутачны рух параходаў па р. Прыпяць.

**90 гадоў** з часу пераўтварэння (1936 г.) сямігадовай школы ў в. Слабада ў сярэднюю.

**90 гадоў** з часу масавага перасялення (1936-1938 гг.) хутароў у вёскі. Па раёну на новае месца перавезена 400 хутароў.

**90 гадоў** з часу заснавання (1936 г.) Рагачоўскага настаўніцкага інстытута. Дзейнічаў у 1936-1941 гг. У 1944 г. пераведзены ў Мазыр і пераўтвораны ў Мазырскі настаўніцкі інстытут. Цяпер - Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна».

**85 гадоў** з пачатку дзейнасці (верасень, 1941 - студзень, 1944) Мазырскага антыфашысцкага падполля ў Мазыры і Мазырскім раёне ў час Вялікай Айчыннай вайны.

**80 гадоў** таму назад (1946 г.) была запушчана ў эксплуатацыю першая чарга Мазырскай ГЭС.

**80 гадоў** таму назад (1946 г.) пачалося будаўніцтва рамонтна-экскаватарнага завода (зараз ААТ «Мазырскі машынабудаўнічы завод»).

**80 гадоў** з часу заснавання (1946 г.) філіяла гарадская бібліятэка № 1.

**75 гадоў** з часу заснавання (1951 г.) філіяла гарадская бібліятэка № 2.

**75 гадоў** з часу заснавання (1951 г.) Мазырскай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага свідравання. Знаходзіцца ў распараджэнні РУП «Белгеалогія».

**70 гадоў** з часу заснавання (1956 г.) Забалацкай сельскай бібліятэкі- клуба (не існуе з 01.01.2016 г.).

**70 гадоў** з часу заснавання (1956 г.) Мазырскай фабрыкі мастацкіх вырабаў, РУП у складзе дзяржаўнага гандлёвага аб'яднання «Белмастацпромыслы» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**55 гадоў** з пачатку будаўніцтва (1971 г.) Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода.

**50 гадоў** з часу заснавання (1976 г.) філіяла гарадская бібліятэка № 7.

**40 гадоў** з часу адкрыцця (1986 г.) санаторыя «Сосны» Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода ў в. Стрэльск Мазырскага раёна.

**35 гадоў** з часу заснавання (1991 г.) Сасноўскай сельскай бібліятэкі-клуба. (не існуе з 01.01.2017 г.)

## Студзень

**1** - **130** гадоў з дня нараджэння **Шварца Самуіла Аронавіча** ( 01.01.1896, г. Мазыр - 15.03.1979), музыканта і кампазітара.

**2** - **65** гадоў з дня нараджэння **Канопліч Наталлі Мікалаеўны** ( 02.01.1961, н. в. Мокіш Хойніцкага раёна), журналіста, беларускай пісьменніцы. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Член Беларускага саюза журналістаў. Працуе ў Мазырскай раённай газеце «Жыццё Палесся».

**5** - **95 гадоў** з дня нараджэння **Піліповіча Уладзіміра Антонавіча** (05.01.1931, в. Слабада Мазырскага раёна - 01.04.2018, г. Мінск), беларускага вучонага ў галіне лазернай фізікі і аптычнай апрацоўкі інфармацыі. Акадэмік НАН Беларусі (1980), член-карэспандэнт (1977). Доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1977). Заслужаны дзеяч навук Беларусі (1978). Лаўрэат прэміі СССР (1985). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1981). Аўтар звыш за 400 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій.

**9** - **60 гадоў** з дня нараджэння **Стацэнка Святланы Адамаўны** (н. 09.01.1966, г. Мазыр), беларускага музычнага дзеяча, педагога, спявачкі. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (2007). Мастацкі кіраўнік цэнтра музычнага мастацтва імя У. Мулявіна.

**10** - **85 гадоў** з дня нараджэння **Андрыеўскага Аляксандра Паўлавіча** (н. 10.01.1941, в. Міхалкі Мазырскага раёна), трэнер, выдатнік народнай адукацыі Беларусі.

**15** - **85 гадоў** з дня нараджэння **Касцяна Сяргея Іванавіча** (н. 15.01.1941, Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці), дзяржаўнага дзеяча Беларусі, вучонага-гісторыка, педагога, выдатніка народнай адукацыі Беларусі.

**22** - **105 гадоў** з дня нараджэння Жукава Пятра Сяргеевіча (22.01.1921, в. Мікулічы Брагінскага раёна - 22.12.1967, г. Мазыр), Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

## Люты

**15** - **95** гадоў з дня нараджэння **Рудкоўскага Іосіфа Максімавіча** (15.02.1931, в. Бузава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласц - 08.01.1996, г. Мазыр), Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Працаваў інжынерам буравой № 1 у Мазырскай канторы разведачнага бурэння.

**21** - **40 гадоў** з часу заснавання (21.02.1986) ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння **«Мазырскія яры»** з мэтай захавання, рэкрэацыйнага выкарыстання і павышэння ўстойлівасці лагчынна-яравых утварэнняў. Агульная плошча 1019,77 га. У заказніку зарэгістравана 496 відаў раслін, частка занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі.

**23** - **75 гадоў** з дня нараджэння **Валетава Валянціна Васільевіча** (23.02.1951, в. Востраў Ельскага раёна - 2020, г. Мазыр), беларускага вучонага ў галіне леса і балотазнаўства. Доктар біялагічных навук (1993). Прафесар (1998). Аўтар больш за 300 навуковых прац, у т.л. 14 манаграфій, 25 вучэбна-метадычных дапаможнікаў, рэкамендацый, курсаў лекцый. З 1997 г. па 2018 г. - рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна.

## Сакавік

**7** - **120** **гадоў** з дня нараджэння **Алексіеўскага Яўгенія Яўгенавіча** (07.03.1906 - 01.01.1979), удзельніка вызвалення Мазыра, дзяржаўнага дзеяча. Ганаровы грамадзянін г. Мазыра (1974). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна.

**9** - **75 гадоў** з дня нараджэння **Козенкі Мікалая Аляксеевіча** (н. 09.03.1951, г. Мазыр), этнахарэолага, педагога,рэжысёра,дзеяча аматарскай творчасці.

## Красавік

**2** - **45 гадоў** з дня нараджэння **Скуркоўскага Аляксея Леанідавіча** (н. 02.04.1981, г. Мазыр), беларускага спартсмена (веславанне на байдарках). Майстар спорту Беларусі міжнароднага класса (2001). Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (2002, г. Севілья, Іспанія) на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыі 500 м.Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (2001, г. Мілан, Італія) на байдарцы-чацвёрцына дыстанцыі 500 м і 1000 м. Пасля заканчэння кар'еры прафесійнага спартсмена працаваў у Гомельскім аблвыканкаме, з 2011 года ўзначальвае Цэнтр алімпійскага рэзерву г. Жлобіна. З лістапада 2019 года - генеральны дырэктар хакейнага клуба "Гомель".

## Чэрвень

**9** - **85 гадоў** з дня нараджэння **Архіяпіскапа Арыстарха** (у свеце **Андрэй Еўдакімавіч Станкевіч,** 09.07.1941, в. Асавецкая Буда, Петрыкаўскі раён, Гомельская вобласть - 23.04.2012), япіскап Рускай праваслаўнай царквы, архіяпіскап Гомельскі і Жлобінскі.